# На тым тыдні...

✓Беларусь першай з 24-х краінаў **завяршае рэалізацыю глабальнага праекта ПРААН-ГЭФ «Узмацненне людскіх рэсурсаў, прававых сістэмаў і інстытуцыйнага патэнцыялу для рэалізацыі Нагойскага пратакола»**. Ён выконваўся ў 2018 – 2019 гг. Інстытутам генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі метадам нацыянальнага выканання. Асноўнаю мэтаю была распрацоўка нацыянальнай сістэмы доступу да генетычных рэсурсаў для прытрымання Нагойскага пратакола рэгулявання доступу да генетычных рэсурсаў і сумеснага выкарыстання на справядлівай і роўнай аснове выгодаў ад іх прымянення да Канвенцыі аб біялагічнай разнастайнасці. Адзін з кампанентаў праграмы прадугледжвае вывучэнне нацыянальных традыцыйных ведаў, звязаных з генетычнымі рэсурсамі; і такія даследаванні ў нашай краіне былі праведзеныя ўпершыню. З гэтай нагоды **11 кастрычніка** ў Мінску ў гатэлі «Еўропа» прайшоў заключны семінар праекта. Удзел бралі прадстаўнікі НАН Беларусі, уладаў, каардынатары глабальнага праекта з Рэгіянальнага бюро ПРААН для краінаў Еўропы і СНД.

✓**14 кастрычніка** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася **прэзентацыя кнігі «Белорусская государственная академия авиации: история и перспективы развития»**. Удзел бралі кіраўнікі акадэміі і ганаровыя госці. На мерапрыемстве былі прадэманстраваныя выданні з фондаў НББ пра гісторыю сусветнай і айчыннай авіяцыі, пра гісторыю акадэміі авіяцыі.

✓**15 кастрычніка** ў Мастацкай галерэі Беларт ГА «Беларускі саюз мастакоў» **прайшло адкрыццё выстаўкі акварэлі Міхаіла Няхайчыка.** Экспазіцыя прымеркаваная да 60-годдзя мастака і знаёміць з новымі творамі прызнанага майстра акварэлі: беларускія пейзажы, акварэльныя аркушы з вандровак па іншых краінах.

Пабачыць працы можна да 30 кастрычніка.

✓**16 кастрычніка** Літаратурны музей Максіма Багдановіча ў рамках праекта «Я кнігу маю» запрасіў на **прэзентацыю зборніка вершаў Андрэя Хадановіча «Школа травы».** У кнігу ўвайшлі новыя творы паэта, у якіх аўтар вандруе ў прасторы і блукае ў часе, сумоўнічае з класікай і лістуецца са Святым Мікалаем, эксперыментуе ў інтымнай і фліртуе з грамадзянскай лірыкай, архівуе ўспаміны і калекцыянуе пахі травы. У вечарыне бралі ўдзел калегі аўтара, музыкі з гурта «Five – storey ensemble».

✓У Мастацкай галерэі Міхася Савіцкага **16 кастрычніка** адбылося **адкрыццё выстаўкі працаў «Арт-упакоўка»** студэнтаў IV курса спецыяльнасці «Графічны дызайн» Беларускай акадэміі мастацтваў. Праект створаны паводле вынікаў сумеснага цыкла аўтарскіх навучальных курсаў дызайнера-педагога, плакатыста Руслана Найдзена і прысвечаны 100-годдзю УНОВИСА.

Выстаўка працуе па 27 кастрычніка.